УДК 94 (476)

*Л.В. Лаўрэенка*

# РАМЕСНАЕ НАВУЧАННЕ І ЯГО АРГАНІЗАЦЫЯ НА ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 20–30-я гг. XX ст.

У артыкуле разглядаецца стан раменснага навучання і яго арганізацыя на заходнебеларускіх землях у 20–30-я гг. XX ст. Характарызуюцца рамесна-прамысловыя школы, школы-майстэрні, школы прафесійнага ўдасканалення, а таксама прафесійныя курсы, якія займаліся навучаннем раменнікаў. Падрабязна прааналізаваны ўмовы прыняцця на навучанне і заключэння дамовы аб навучанні. Разглядаецца сістэма здачы экзаменаў на атрыманне звання чаляднiка і майстра. Адзначаецца, што ў разглядаемы перыяд раменніку, які толькі пачынаў сваю працу ці працаваў у якой-небудзь галіне рамяства, неабходна было абавязкова прайсці навучанне рамяству і атрымаць адпаведнае пасведчанне. У артыкуле зроблена высновa аб тым, што раменнае навучанне на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд было складаным і сутыкалася з вялікай колькасцю цяжкасцей.

## Уводзіны

Развіццё тэхнікі, змена ўмоў вытворчасці і збыту, ускладненне эканамічных адносін у цэлым ставілі заходнебеларускага раменніка ў 20–30-я гг. XX ст. перад складанай задачай прыстасавання да новых умоў, што было немагчыма без адпаведнай прафесійнай падрыхтоўкі. Закон аб прамысловым праве 1927 г. прызначаў сведчанне аб праходжанні прафесійных школ і курсаў у якасці галоўнай умовы атрымання доказу прафесійных здольнасцей і дазволу на кіраванне самастойнай майстэрняй. Недахоп прафесійнай адукацыі, асабліва сярод раменнай моладзі, быў раўназначны пазбаўленню права займацца якой-небудзь раменнай прафесіяй. Таму раменнае навучанне адыгрывала значную ролю ў развіцці рамяства і раменнай вытворчасці ў 20–30-я гг. XX ст. на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Польшчы ў цэлым. У айчыннай гістарыяграфіі пакуль не існуе прац, прысвечаных станаўленню і развіццю раменнага навучання, яго арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Агульныя звесткі па тэме даследавання апісаны ў працы А.М. Вабішчэвіча [1]. З існуючых польскіх даследаванняў неабходна адзначыць працу І. Барнштэйна, у якой толькі адзін раздзел прысвечаны пытанням прафесійнай адукацыі раменнікаў-яўрэяў на тэрыторыі Польшчы [2]. Сярод сучасных польскіх гістарычных прац неабходна згадаць працу Ю. Менсо [3], якая змяшчае статыстычны абзор развіцця прафесійнага навучання ў Польшчы ў міжваенны перыяд, і манаграфію С. Квеценя, у якой аналізуюцца асноўныя заканадаўчыя акты ў сферы раменнага навучання [4]. Аднак спецыяльнага даследавання па згаданай тэматыцы ў польскай гістарычнай навуцы няма.

Улічваючы слабую распрацаванасць праблематыкі развіцця раменнага навучання на заходнебеларускіх землях у акрэслены перыяд, уяўляецца неабходным даследаваць стан раменнага навучання і яго арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. Для дасягнення пастаўленай мэты былі вылучаны наступныя задачы: 1) даць характарыстыку раменнаму навучанню і яго арганізацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.; 2) вызначыць асноўныя праблемы раменнага навучання на за-ходнебеларускіх землях у даследуемы перыяд.

## Арганізацыя раменнага навучання на тэрыторыі Заходняй Беларусі

Неспрыяльныя ўмовы развіцця рамяства рабілі немагчымым адпаведную падрыхтоўку і навучанне кваліфікаваных раменніцкіх кадраў. Узровень адукацыі сярод ра-

---

Навуковы кіраўнік – А.М. Вабішчэвіч, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна

меснікаў у міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі быў вельмі нізкі: значная частка рамеснікаў была непісьменнай. Рашэннем праблемы рамеснага навучання займаліся прафесійныя школы: рамесна-прамысловыя, школы-майстэрні, школы прафесійнага ўдасканалення, а таксама прафесійныя курсы, у якіх ускосна ўсталёўвалася мінімальны тэрмін навучання, а таксама вызначаўся ўзровень навучання праз правядзенне экзаменаў на атрыманне звання чаляднiка і майстра ў выбранай прафесіі [5, арк. 15; 2, с. 84].

Найбольш вядомымі прафесійнымі школамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі наступныя: рамесная школа Польскай мацежы школьнай (ПМШ) у Пінску (сталярны аддзел), рамесная школа Таварыства распаўсюджвання прафесійнай і гаспадарчай працы сярод яўрэяў са слясарна-механічным, сталярным і кравецкім (жаночым) аддзеламі ў Брэсце, рамесная школа кравецкага рамяства для дзяўчат у Пінску, ніжэйшая тэхнічная школа ў Лунінцы, яўрэйская рамесная школа Юдэля Пекача са слясарна-механічным і сталярным аддзеламі ў Пінску (Палескае ваяводства); дзяржаўная рамесна-прамысловая школа ў Лідзе, рамесная школа выхаваўчай установы Св. Іосіфа са сталярным і шавецкім аддзеламі ў Дварцы, прафесійная жаночая школа Саюза памежных зямель у Ішчольне, прыватная прамысловая жаночая школа ў Нясвіжы (Навагрудскае ваяводства); прафесійная жаночая школа ПМШ у Нова-Вілейцы, школа хатняй гаспадаркі Саюза грамадзянскай працы кабет у Вільні (Віленскае ваяводства); дзяржаўная рамесна-прамысловая школа ў Беластоку, дзяржаўная гандлёва-прамысловая школа ў Гродне, яўрэйская рамесная школа ў Беластоку, дзяржаўная школа дрэваапрацоўчай прамысловасці ў Гайнаўцы, школа рамёстваў ПМШ у Гродне, жаночая рамесная школа таварыства «ORT» у Беластоку, рамесная школа пры яўрэйскай гміне ў Гродне (Беластоцкае ваяводства) [6, с. 36; 7, с. 20].

На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства ў 1932 г. існавала 4 рамесна-прамысловыя школы і 4 школы прафесійнага ўдасканалення, у якіх навучалася 594 вучні. З 359 вучняў школ прафесійнага ўдасканалення ў 1932/33 навучальным годзе школу закончылі толькі 52 вучні [7, с. 20]. У Віленскім ваяводстве ў 1932 г. налічвалася 14 прафесійных школ (3 дзяржаўныя і 11 прыватных), у якіх навучалася 1 150 вучняў, і 6 школ прафесійнага ўдасканалення з 423 вучнямі (скончылі школы толькі 59 чалавек) [8, с. 48–49].

Важная роля ў развіцці рамеснага навучання на тэрыторыі Навагрудскага і Віленскага ваяводстваў у 30-я гг. XX ст. адводзілася Віленска-Навагрудскаму рамеснаму інстытуту ў Вільні. Нізкі культурны ўзровень рамяства на заходнебеларускіх землях, вялікая колькасць непісьменных, амаль поўнае няведанне сучасных вынаходак, метадаў працы і арганізацыі майстэрань стваралі няроўныя ўмовы працы на дадзеных тэрыторыях у параўнанні з цэнтральнымі, а асабліва з заходнімі тэрыторыямі. Для выпраўлення становішча Віленскай і Навагрудскай рамеснымі палатамі было вырашана стварыць 7 мая 1934 г. сумесны рамесны інстытут, які пачаў сваю працу ў Вільні з кастрычніка 1934 г. Старшынёй інстытута быў выбраны дырэктар рамеснай палаты ў Вільні Казімір Млынарчык, наменікам старшыні – дырэктар рамеснай палаты ў Навагрудку Станіслаў Кленеўскі [9, с. 39]. Асноўнымі мэтамі дадзенай установы былі: 1) асвета рамеснікаў у прафесійным, эканамічным і культурным напрамках; 2) аказанне ўплыву на павышэнне ўзроўню прафесійнай адукацыі рамесніцкай моладзі, а таксама на яе грамадзянскае выхаванне; 3) клопат аб адпаведным навучанні рамеснікаў [10, с. 25]. Дзякуючы намаганням інстытута была арганізавана гарбарная майстэрня, якая, з аднаго боку, была вытворчай майстэрняй, з якой бралі прыклад вясковыя і маламестачковыя гарбары, а з другой – навучальнай установай. Нягледзячы на тое, што дадзеная майстэрня не мела вялікага капіталу і першапачаткова апіралася на сціплыя субсідыі Віленскай рамеснай палаты, яна дасягнула пэўных поспехаў, нарпыклад, залаты медаль на кушнерскай ярмарцы ў Вільні ў 1934 г. і срэбны на агульнапольскай ярмарцы рамяства ў Познані ў 1935 г. [9, с. 39–40].

У пачатку 1935 г. у Вільні была заснавана школа прафесійнага ўдасканалення Віленска-Навагрудскага рамеснага інстытута, у якой навучалі рамесніцкім спецыяльнасцям групы апрацоўкі скуры, спажывецкай сферы і сферы паслуг. У лютым 1935 г. інстытут прыняў ад віленскага таварыства апекі над жывёламі школу коўкі коней, якая дзейнічала з 1927 г. У 1935 г. у школе працавалі курсы, на якіх навучаліся кавалі ў асноўным з паветаў Віленскага і Навагрудскага ваяводстваў. Кандыдатаў з правінцыі ў школе не было па прычыне вясенніх сельскагаспадарчых работ. Кожны вучань курса плаціў 10 злотых экзаменацыйнай платы і 50 злотых за інтэрнат з поўным утрыманнем. Само навучанне было бясплатным. У хуткім часе школа выклікала вялікую зацікаўленасць сярод мясцовых рамеснікаў [9, с. 40].

На тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1935 г. было 6 рамесна-прамысловых мужчынскіх школ, у якіх навучаліся 562 вучні, і 4 жаночыя з 321 вучаніцай. Акрамя гэтага, на тэрыторыі ваяводства дзейнічалі 16 рамесных майстэрань пры грамадскіх школах, з іх 7 – майстэрні крою і шыцця, 6 – сталярныя майстэрні і 3 – майстэрні па вырабу кошыкаў, у якіх праходзіў навучанне рамяству 941 вучань. У 1936 г. колькасць рамесна-прамысловых школ у ваяводстве ў параўнанні з 1935 г. амаль не змянілася – 5 мужчынскіх (629 вучняў) і 4 жаночыя (385 вучняў) [11, с. 48; 12, с. 31]. Колькасць рамесных майстэрань павялічылася на 2 (майстэрня крою і шыцця і сталярная) і склала 18 адзінак, у якіх навучаліся 1 377 вучняў. На тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1936 г. налічвалася 6 школ прафесійнага ўдасканалення (у Брэсце, Давыд-Гарадку, Кобрыне, Лунінцы, Пінску і Пружанах), у іх праходзілі навучанне 600 вучняў [5, арк. 15], а на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства – 10 школ [13, с. 26]. Аднак у справаздачы Брэсцкай рамеснай палаты за 1936 г. акцэнтуецца ўвага, што на тэрыторыі акругі палаты назіраўся недахоп такіх школ для дзяўчат, нягледзячы на тое, што ў 1933 г. у Пінску і Лунінцы былі адкрыты 3-гадовыя прафесійныя жаночыя школы ПМШ [14, арк. 2, 3]. Паводле статыстыкі палаты, школы Брэста і Пінска мелі значны працэнт дзяўчат, якія навучаліся рамяству [5, арк. 15].

У 1929 г. быў уведзены падзел прафесійных школ на 2 катэгорыі: A і B. Да катэгорыі A адносіліся школы, пры якіх маглі быць утвораны камісіі для прыёму экзаменаў на атрыманне звання чалядніка; астатнія, пазбаўленыя дадзенага права, належалі да катэгорыі B [2, с. 82]. Таму школы катэгорыі B павінны былі штогод пасылаць сваіх выпускнікоў для здачы іспытаў у школы катэгорыі A. Такое становішча было нязручным як для вучняў, так і для рамесных школ, у якіх яны праходзілі навучанне. Нязручнасць заключалася ў тым, што, па-першае, вучні вымушаны былі здаваць экзамен перад пабочнай, незнаёмай ім камісіяй; па-другое, практычная частка экзамена выконвалася пры дапамозе нявыпрабаваных інструментаў, часта на машынах агульных тыпаў і іншай канструкцыі (вучні, якія здавалі экзамен перад камісіяй сваёй школы, былі ў больш выгадных умовах, бо працавалі на выпрабаваных імі ж інструментах і станках [2, с. 84]. У 1928/29 навучальным годзе на тэрыторыі Палескага ваяводства да катэгорыі A былі аднесены такія школы: гарадская рамесная школа ў Брэсце, рамесная школа ПМШ у Пінску і Сарнах, ніжэйшая тэхнічная чыгуначная школа Таварыства распаўсюджвання прафесійнай асветы ў Лунінцы [15, арк. 10–11].

Пэўнае месца ў рамесным навучанні адводзілася прафесійным курсам. Працягласць навучання на прафесійных курсах была разнай і залежала ад таго, для якой прафесіі і якой аўдыторыі яны былі арганізаваны. Вялікае значэнне мелі таксама характар курсаў і мясцовасць, дзе яны праводзіліся. У сувязі з гэтым прафесійныя курсы падзяляліся на двухгадовыя, гадавыя, а таксама курсы, якія працягваліся некалькі месяцаў і нават тыдняў (спецыяльна з мэтай навучання ці падрыхтоўкі да якога-небудзь прафесійнага экзамена). У цэлым польскія ўлады, установы ці прыватныя асобы імкнуліся, каб прафесійныя курсы не працягваліся звыш патрэбнага для авалодання неабходнымі

прафесійнымі і тэарэтычнымі ведамі часу. Тэрміны навучання на курсах залежалі таксама і ад выдаткаў, з якімі было звязана наведванне курсаў для рамесна-прамысловых работнікаў ці кандыдатаў для заняткаў рамяством. Асноўная частка прафесійных курсаў для рамеснікаў на заходнебеларускіх землях арганізоўвалася рамеснымі палатамі сумесна з упраўленнямі школьных акруг.

У 1935 г. на тэрыторыі Палескага ваяводства дзейнічала 6 курсаў крою і шыцця, 3 ткацтва, арганізаваны 4 новыя курсы трыкатажнай вытворчасці. Рамеснай палатай таксама былі арганізаваны 7 курсаў прафесійнага ўдасканалення для 253 вучняў і рамесных чаляднікаў пры дапамозе і падтрымцы кіраўніцтва Брэсцкай школьнай акругі (3 у Брэсце, 1у Століне, 2 у Давыд-Гарадку і 1 у Кобрыне), а таксама курсы для механікаў пры рамесна-прамысловай школе ў Брэсце [5, арк. 16]. У 1936 г. Брэсцкай рамеснай палатай былі арганізаваны кароткатэрміновыя курсы і інфармацыйныя сходы для самастойных рамеснікаў. Кароткатэрміновыя курсы для рамеснікаў будаўнічай групы праводзіліся ў Кобрыне. Мэтай кароткатэрміновых курсаў было папаўненне прафесійных ведаў рамеснікаў, якія займаліся рамяством больш за 10 гадоў і якія былі пазбаўлены магчымасці дапоўніць свае прафесійныя веды. Інфармацыйныя сходы для самастойных рамеснікаў былі арганізаваны ў Брэсце, Пінску, Пружанах і Кобрыне [5, арк. 16].

На тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ў 1936 г. рамеснай палатай былі арганізаваны курсы прафесійнага ўдасканалення для вучняў і памочнікаў розных рамесных спецыяльнасцей у Шчучыне. Курсы ў аб’ёме 143 лекцыйных гадзін праходзілі з 3 лютага па 15 чэрвеня 1936 г. па наступных прадметах: польская мова, лічэнне, гісторыя і геаграфія (з паланістыкай). На курс было залічана 69 вучняў. Задачай курсаў была падрыхтоўка курсантаў да іспыту на атрыманне звання чаляднíка ў аб’ёме агульнаадукацыйных прадметаў. Другія чарговыя курсы прафесійнага ўдасканалення былі арганізаваны ў Гайнаўцы і працягваліся з 23 сакавіка па 26 чэрвеня 1936 г. ў аб’ёме 180 лекцыйных гадзін: матэрыялазнаўства, тэхналогія, разлікі, прафесійны чарцёж (разам 90 гадзін), лічэнне (30 гадзін), польская мова (35 гадзін), паланістыка (25 гадзін). Дадзеныя курсы наведвала 28 чалавек: 23 слесары і 5 сталяроў. Асноўнай задачай курсаў была падрыхтоўка слухачоў да іспыту на атрыманне звання чаляднíка па прафесійных і агульнаадукацыйных прадметах [13, с. 26]. У 1932 г. праўленне Віленскай школьнай акругі выдала канцэсіі Саюзу польскіх настаўнікаў на правядзенне курса прафесійнага ўдасканалення для вучняў у Нясвіжы (наведвала 32 навучэнцы розных прафесій) і Саюзу польскіх настаўнікаў Стаўбцоўскага павета на правядзенне курса ў Стоўбцах (скончылі 18 вучняў: 9 краўцоў, 2 цырульнікі, 1 маляр, 3 сталяры, 1 шорнік, 1 слесар і 1 цясляр) [7, с. 22].

Акрамя курсаў, арганізаваных рамеснымі палатамі, шырокае распаўсюджанне атрымалі і прыватныя курсы. Так, напрыклад, у 1926 г. Міністэрствам рэлігійных веравызнанняў і грамадскай асветы быў выдадзены дазвол Яну Служэўскаму на адкрыццё ў Пружанах гарбарна-скарняжных курсаў для сялян, а таксама аказана матэрыяльная дапамога ў памеры 1 000 злотых. Курсы мелі падтрымку ад ураду і былі пад кантролем школьных улад. Навучанне на курсах было бясплатным [16, арк. 2, 11, 12]. 6 лютага 1933 г. кіраўніцтва Брэсцкай школьнай акругі выдала Адаму Душу дазвол на адкрыццё і правядзенне ў Брэсце прыватных курсаў крою і шыцця [14, арк. 1]. У 1935–1936 гг. на тэрыторыі Брэсцкай школьнай акругі дзейнічалі наступныя прыватныя курсы: прафесійныя курсы розных рамёстваў; курсы па зборы і лячэнні лекавымі раслінамі (за 1935 г. на гэтых курсах прайшло навучанне 3 200 вучняў), курсы стэнаграфіі інжынера Закржэўскага ў Брэсце; курсы крою і шыцця, пакоры і хатняй гаспадаркі Саюза грамадзянскай працы кабет у Брэсце; курсы айчыннай гаспадаркі ў Лунінцы; курсы крою, шыцця і вышыўкі збору сясцёр-місіянерак у Пружанах; курсы крою і шыцця, мадэльерства і мастацкіх работ Барбары Альшэўскай у Брэсце [17, л. 3зв.].

Акрамя таго, згодна распараджэння міністра прамысловасці і гандлю ад 14 снежня 1927 г. [18], дапоўненага распараджэннем ад 25 мая 1938 г. [19], у якасці пацвярджэння прафесійных здольнасцей у кавальскім, слясарным, такарным рамястве, а таксама ў рамястве кацельшчыка маглі ўлічвацца пасведчанні аб заканчэнні механічнага і чыгуначна-механічнага аддзелаў дзяржаўнай тэхнічнай школы імя Ю. Пілсудскага ў Вільні. Для бляхара, страхара, камнеапрацоўчага рамяства, печніка, дарожніка, муляра і цесляра – пасведчанні аб заканчэнні будаўнічага, дарожна-воднага і меліярацыйнага аддзелаў дзяржаўнай тэхнічнай школы імя Ю. Пілсудскага ў Вільні, дарожна-будаўнічага і меліярацыйнага аддзелаў сярэдняй тэхнічнай школы імя Ю. Пілсудскага ў Брэсце, прыватнай мужчынскай дарожнай школы ПМШ у Баранавічах [19, с. 696–698].

Навучаць рамяству, паводле закона аб прамысловым праве, маглі тыя раменнікі, якія мелі званне майстра, ці паўналетнія асобы, што пасля паспяховай здачы іспыту на чаляднiка працавалі на працягу 5 гадоў у дадзеным рамястве альбо 8 гадоў самастойна займаліся рамяством. Навучанне можна было прайсці таксама на фабрычных прадпрыемствах пад кіраўніцтвам асоб, якія мелі адпаведную кваліфікацыю [20, с. 714]. На аснове распараджэння Міністэрства прамысловасці і гандлю ад 14 снежня 1927 г., выдадзенага сумесна з Міністэрствам рэлігійных веравызнанняў і грамадскай асветы, права ўтрымання вучняў і кіраўніцтва іх практычным навучаннем мелі таксама асобы, якія валодалі пасведчаннем аб заканчэнні адной з тэхнічных школ, школ майстроў, а таксама школ дэкаратыўнага мастацтва і мастацкай прамысловасці, якія пералічаны ў вышэй згаданым распараджэнні, пры пацвярджэнні хаця б 3-гадовага перыяду самастойнай рамеснай працы [21, арк. 26]. Не мелі права ўтрымоўваць вучняў раменнікі, якія былі асуджаны за злачынствы, здзейсненыя з мэтай выгады ці супраць грамадскай маралі. Права на навучанне вучняў не мелі таксама асобы, якія па прычыне разумовых ці фізічных недахопаў былі не здольныя да адпаведнага навучання [21, арк. 26зв.].

На навучанне прымаліся толькі тыя кандыдаты, якія дасягнулі 15-гадовага ўзросту і мелі дазвол бацькоў ці апекуноў, пасведчанне аб навучанні (калі ў дадзенай мясцовасці вялося ўсеагульнае навучанне), даведку ад лекара, рэкамендаванага Міністэрствам працы, што выбранае рамяство не перавышае фізічных сіл кандыдата, і пасведчанне аб адпаведных здольнасцях у прафесіі [21, арк. 26зв.]. Кандыдат мог быць прыняты на навучанне толькі на аснове пісьмовай дамовы, якая павінна была быць складзена і падпісана на працягу 4 тыдняў пасля пачатку навучання.

Тэрмін навучання быў у асноўным 3 гады, аднак са згоды прамысловай ваяводскай улады рамесная палата пасля прыняцця да ўвагі меркаванняў зацікаўленых рамесных цэхаў магла ў некаторых рамёствах і іх галінах устанаўляць працягласць навучання. Рамесная палата ў асобных выпадках таксама магла дазволіць вучню закончыць навучанне раней адведзенага тэрміну [20, с. 714]. Пасведчанне аб заканчэнні навучання маглі выдаваць кіраўніцтва цэху (ў тым выпадку, калі раменнік з'яўляўся членам цэху) ці сам раменнік, калі ён не належаў да якога-небудзь цэху.

Навучанне ў майстэрнях часта было фармальным, вучань выкарыстоўваўся майстрам у якасці памагатага, што павялічвала прадукцыйнасць працы майстра і, адпаведна, прыбыткі, бо праца вучня ў перыяд навучання ў раменніка-майстра не аплачвалася. Інспектары працы ў сваіх справаздачах сцвярджалі, што колькасць вучняў увесь час павялічвалася, уладальнікі майстэрняў усё часцей звальнялі чаляднікаў і карысталіся вучнямі як таннай працоўнай сілай. Такім чынам, з майстэрняў выцяснялася кваліфікаваная рабочая сіла. Шмат рамесных майстэрняў з-за адсутнасці фінансавання не мела адпаведнага абсталявання і інструментаў, каб азнаёміць вучня з сукупнасцю дзеянняў, якія ўваходзілі ў яго прафесію [22, с. 5, 7, 8]. Вучні часцей пражывалі ў свайго майстра. Умовы працы ў майстэрнях былі складанымі як з пункту гледжання гігіены (дробныя майстэрні служылі ўладальніку адначасова і жыллём, таму для іх была характэрна цес-

ната, бруд і духата), так і паводле працягласці часу працы [22, с. 28]. Пра навучанне рамяству жыхарка вёскі Орля Вера Сушч расказвала наступнае: «Пасля сёмага класа я не магла вучыцца з-за нястачы грошай. Дзяцей у нас было трое: я, брат Валодзя і сястра Валя. Бацька працаваў у тартаку, маці займалася домам. Праз год пасля заканчэння школы пайшла я вучыцца на краўчыху. Мая майстрыха, родам з Познані, жыла недалёка бажніцы. Разам з дзвюма іншымі вучаніцамі шылі мы розныя строі, сукенкі, якія насілі потым па дамах і прадавалі. Навука мая працягвалася цэлы год. Пасля шыла я дома на мамінай машыне маркі «Зінгер», якую мама купіла сабе ў 1920 г.» [23, с. 181].

Пасля сканчэння тэрміну навучання вучань павінен быў здаваць іспыт. Для гэтага рамесная палата стварала экзаменацыйную камісію, якая складалася са старшыні і 2 членаў палаты. Старшынёй камісіі прызначаўся рамеснік, які меў тытул майстра, ці асоба, якая мела вышэйшую тэхнічную адукацыю і працавала выкладчыкам ці кіраўніком прамысловага прадпрыемства. Адзін з членаў экзаменацыйнай камісіі выбіраўся сярод кваліфікаваных у дадзенай галіне рамяства чаляднікаў і павінен быў абавязкова пражываць на тэрыторыі акругі палаты. Астатнія члены экзаменацыйнай камісіі выбіраліся сярод рамеснікаў, якія мелі права навучання дадзенаму рамяству і пражывалі на тэрыторыі, падуладнай рамеснай палаце [20, с. 714].

Іспыт праходзіў у памяшканні рамесна-прамысловай школы. Час правядзення іспыту вызначаў куратар школьнай акругі сумесна з адпаведнай рамеснай палатай ці з інструктарам прамысловых карпарацый, калі на дадзенай тэрыторыі рамесная палата не дзейнічала. Склад экзаменацыйнай камісіі, яе члены і старшыня прызначаліся куратарам школьнай акругі. Старшыня камісіі павінен быў у пісьмовай форме за 10 дзён да вызначанага тэрміну паведаміць кандыдатам, а таксама членам камісіі пра час і месца правядзення іспыту. Сам іспыт на атрыманне звання чаляднiка праходзіў на польскай мове і складаўся з дзвюх частак: практычнай і тэарэтычнай. Практычная частка ўключала ў сябе г.зв. «майстэрства чаляднiка» – выкананне працы, якая патрабавала пэўных ведаў і ўменняў і якая цягнулася не больш за 3 працоўныя дні, а таксама выпрабавальнай працы (калі гэта неабходна для здачы экзамену), на выкананне якой адводзілася 3 працоўныя гадзіны. У выпадку паспяховага выканання практычнай часткі іспыту кандыдат дапускаўся да тэарэтычнай часткі.

Тэарэтычная частка іспыту працягвалася 2 гадзіны, прычым кандыдата нельга было апытваць больш за 30 хвілін без перапынку. Мэтай тэарэтычнага іспыту з’яўлялася пацверджанне камісіяй таго, што кандыдат валодаў уменнямі і навыкамі, неабходнымі ў адпаведным рамястве, меў пэўныя веды адносна кошту, набыцця, захавання і выкарыстання матэрыялаў, неабходных для сваёй рамеснай працы. Яшчэ кандыдат павінен быў паказаць веданне палажэнняў прамысловага права і сацыяльнага забеспячэння, неабходных для рамеснай працы. У выпадку паспяховай здачы іспыту камісія выдавала адпаведнае пасведчанне з пячаткай школы, якое падпісвалі старшыня экзаменацыйнай камісіі і прадстаўнік рамеснай палаты. У тым выпадку, калі вучань не здаваў іспыт, камісія вызначала тэрмін, пасля сканчэння якога можна было пераздаць экзамен [24, с. 52–54; 20, с. 714–715].

Так, на тэрыторыі Брэсцкай рамеснай палаты 27 кастрычніка 1928 г. у Высока-Літоўску праходзіў практычны і тэарэтычны іспыт на атрыманне прафесіі мясніка. З 24 чэрвеня па 10 ліпеня 1929 г. у гарадской рамеснай школе ў Брэсце, рамеснай школе ПМШ у Пінску і Сарнах праходзілі іспыты на атрыманне прафесіі сталяра, а з 1 па 5 ліпеня таго ж года ў рамеснай школе ПМШ у Сарнах і ніжэйшай тэхнічнай чыгуначнай школе ў Лунінцы – іспыты на атрыманне прафесіі слесара [25, арк. 5; 26, арк. 64–65]. 4 верасня 1929 г. ў Брэсце праходзіў іспыт на атрыманне звання чаляднiка ў прафесіі каўбасніка. З 9 кандыдатаў толькі 6 змаглі здаць практычную частку, а тэарэтычную –

ўвогуле толькі адзін. Як вынік – толькі адзін чалавек атрымаў пасведчанне, астатнія павінны былі пераздаць іспыт праз шэсць месяцаў [27, арк. 23–23зв.].

Былі выпадкі, калі рамеснікі не маглі падаць у экзаменацыйную камісію дакументаў аб тым, што яны мелі неабходныя прафесійныя здольнасці для самастойнага вядзення рамяства. Таму яны вымушаны былі звяртацца да ваяводскага ўпраўлення з прашэннямі дапусціць іх да іспыту без падачы такіх дакументаў. Так, напрыклад, жыхар Высока-Літоўска Брэсцкага павета Уладзіслаў Мікалаеўскі ў 1928 г. звяртаўся з хадайніцтвам да палескага ваяводскага ўпраўлення, у якім сцвярджаў, што прафесіяй мясніка займаўся на працягу 40 гадоў, быў дастаткова кваліфікаваным спецыялістам у дадзенай прафесіі і мог паспяхова здаць як практычную, так і тэарэтычную часткі іспыту. Але ён не мог дакументальна пацвердзіць наяўнасць неабходных прафесійных здольнасцей, таму вымушаны звяртацца да ваяводскага ўпраўлення з просьбай дапусціць яго да здачы іспыту. З такой жа просьбай да палескага ваяводскага ўпраўлення звяртаўся таксама жыхар Высока-Літоўска Зыгмунт Лажэцкі. У яго прашэнні гаварылася аб тым, што самастойна рамяством мясніка ён займаўся з 1924 г. Але ён не меў неабходных дакументаў, нягледзячы на тое, што праходзіў 3-гадовую практыку навучання сваёй прафесіі ў майстра Хамянтоўскага [25, арк. 21, 36].

Экзаменацыйная аплата складала 10 злотых. Аднак гэтая сума магла быць павялічана ў залежнасці ад колькасці кандыдатаў, якія здавалі іспыт. Так, напрыклад, калі квота экзаменацыйнага збору складала 60 злотых, то плата з кожнага кандыдата вагалася ад 10 да 15 злотых. Калі ж экзамен здавалі толькі 3 кандыдаты, то экзаменацыйная плата магла даходзіць да 20 злотых [27, арк. 2–32]. У выпадку нез'яўлення кандыдата ці адмоўнага выніку іспыту плата не вярталася. У выключных выпадках кандыдат мог быць вызвалены ад экзаменацыйнай платы. Рашэнне аб вызваленні ад аплаты прымаў куратар школьнай акругі. Усе рамесныя палаты ў справаздачах за 1932 г. сцвярджалі, што большасць з кандыдатаў на атрыманне звання чаляднікa, якія падалі заяву на допуск да іспыту, былі вымушаны адмовіцца ад яго па матэрыяльных прычынах, бо экзаменацыйная плата разам з іншымі дадатковымі выдаткамі для вучняў, кандыдатаў у чаляднікі, складала 30–50 злотых. Для кандыдатаў на атрыманне звання майстра сума экзаменацыйнай платы магла складаць і 80 злотых. Паводле дадзеных Віленскай рамеснай палаты, у 1932 г. сума экзаменацыйнай платы на атрыманне звання чаляднікa складала 32 злотых 50 грошай, а на атрыманне звання майстра – 90 злотых [8, с. 58]. У Беластоцкай рамеснай палаце ў 1931 г. з 1 470 кандыдатаў здавалі іспыт толькі 1 328 чалавек, а ў Навагрудскім ваяводстве ў тым жа годзе з 210 кандыдатаў дапушчана было толькі 49. Адной з прычын нядопуску да іспыту (амаль 80% кандыдатаў) была адсутнасць магчымасці ў кандыдатаў унесці экзаменацыйную плату [2, с. 88–89]. Акрамя аплаты рэгістрацыі і экзаменацыйнай платы, вучань павінен быў за свае сродкі набываць неабходныя для працы інструменты, а таксама нёс матэрыяльную адказнасць за іх пашкоджанне ці пашкоджанне выкарыстаных ім матэрыялаў [22, с. 29].

Для кандыдата на атрыманне звання майстра экзаменацыйнай праграмай прадугледжвалася гутарка з камісіяй аб выкананых у яго ўласнай майстэрні працах. Пытанні кандыдату задавалі старшыня і члены камісіі. Вынік іспыту вырашаўся камісіяй большасцю галасоў. Пры роўнай колькасці «за» і «супраць» вырашальнае значэнне меў голас старшыні. У выпадку станоўчага выніку кандыдат адразу ж атрымліваў ад старшыні камісіі дыплом майстра, які падпісваўся ўсімі членамі камісіі. Пры адмоўным – камісія прызначала тэрмін, на працягу якога кандыдат мог зноў здаць іспыт. Усяго кандыдат на атрыманне звання майстра мог выкарыстаць не больш за тры спробы. Старшынёй складаўся і пратакол праходжання іспыту, які падпісваўся ім самім, а таксама членамі экзаменацыйнай камісіі. Пратакол з кожнага іспыту старшыня дасылаў у праўленне рамеснай палаты [28, арк. 52–52зв.]. Так, напрыклад, 29 кастрычніка 1930 г.

на тэрыторыі Палескага ваяводства былі сфарміраваны экзаменацыйныя камісіі на атрыманне звання майстра па наступных рамесных спецыяльнасцях: гадзіншчыкаў-ювеліраў, стэльмахаў, пavaроў, токараў, пераплётчыкаў, шорнікаў [28, арк. 6].

Нягледзячы на дакладна распрацаваную арганізацыю экзаменацыйных камісій нярэдка ўзнікалі праблемы. Так, паводле статыстыкі Палескага ваяводства, у 1930 г. з 67 рамесных прафесій, у 13 не было зарэгістравана ніводнага рамесніка, у 4 – па адным, у адной прафесіі толькі 2 рамеснікі мелі рамесныя карты, а ў 15 прафесіях колькасць выдадзеных рамесных карт складала ад 3 да 10. Выкананне статуту экзаменацыйнай камісіі, згодна з якім камісія павінна была складацца з 3 чалавек, для 49% рамесных прафесій было фактычна немагчымым, г.зн. было спалучана з непераадольнымі цяжкасцямі, злучанымі з недахопам рамеснікаў, якія мелі права навучання ў адпаведнасці з арт. 149 Закона аб прамысловым праве, а таксама па прычыне размяшчэння рамеснікаў на шырокай тэрыторыі ваяводства. Патрабаванне таго ж статуту, па якім старшынёй камісіі павінен быць, як правіла, майстар у дадзеным рамястве, з 67 рамесных прафесій могуць задаволіць толькі 15–18 прафесій [28, арк. 55]. На тэрыторыі Беластоцкага ваяводства сярод 12 730 рамеснікаў, якія мелі свае майстэрні, майстроў было толькі 1 096 [29, с. 31], на тэрыторыі Віленскага ваяводства з 12 203 самастойных рамеснікаў толькі 2 953 з іх мелі дыпломы майстра (1934 г.) [10, с. 33].

**Навучанне яўрэяў на тэрыторыі Заходняй Беларусі**

Становішча вучняў-яўрэяў у рамесным навучанні можна назваць складаным. Прафесійную адукацыю яўрэйская рамесная моладзь атрымлівала галоўным чынам у прыватных рамесных школах, якія існавалі на сродкі розных яўрэйскіх таварыстваў, а таксама на прафесійных курсах. У 1928 г. у Польшчы налічвалася 44 прафесійныя яўрэйскія школы, 6 з якіх размяшчаліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі (мужчынская і жаночая прафесійныя школы ў Беластоку; мужчынская і жаночая прафесійныя школы таварыства «Дапамога працы» ў Вільні і школы рамёстваў у Пінску і Гродне) [30, с. 129].

Адной з вядомых яўрэйскіх школ на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства была прыватная рамесная школа імя В. Высоцкага, якая была заснавана ў 1906 г. Да Першай сусветнай вайны навучанне ў школе ішло на рускай мове і па трох спецыяльнасцях: слясарнай, сталярнай і ткацкай. Падчас вайны школа была зачынена, а яе абсталяванне – знішчана. Толькі ў 1921 г. школа ўзнавіла сваю дзейнасць як ніжэйшая тэхнічная школа з тэкстыльным, слясарным, сталярным і будаўнічым аддзеламі. У 1936/37 навучальным годзе ў школе налічвалася 325 вучняў. За перыяд з 1921 па 1937 гг. школа выпусціла 325 спецыялістаў [31, с. 52–53].

Вялікая роля ў навучанні яўрэяў на тэрыторыі Палескага ваяводства належала яўрэйскай рамеснай школе Юдэля Пекача ў Пінску (слясарна-механічны і сталярны аддзелы), у якой у 1934 г. навучалася 111 вучняў (84 на слясарна-механічным і 30 на сталярным) [32, арк. 11], а ў 1935 г. – 130 чалавек (99 і 31 адпаведна) [33, с. 47]. З гэтага вынікае, што колькасць вучняў у школе з кожным годам павялічвалася (у 1925 г. школу наведвала 82 вучні). У 1925 г. у рамеснай школе працавалі з 8 чалавек на чале з дырэктарам Мордухам Басевічам, выпускніком французскага ўніверсітэта [32, арк. 33]. Навучанне ў школьных майстэрнях пачыналася з 8 гадзін раніцы і працягвалася да 11:15, потым з 12 гадзін да 14. У пятніцу заняткі заканчваліся а 12-й гадзіне. Тэарэтычнае навучанне, акрамя пятніцы і суботы, працягвалася да 18 гадзін. Традыцыйнай была арганізацыя ў школе выставак прац вучняў [32, арк. 73зв., 11]. Адной з буйных яўрэйскіх школ была і рамесная школа Я. Хольцмана (ў 1935 г. налічвала 92 вучні) [33, с. 46].

Нягледзячы на тое, што вялікая частка яўрэйскіх прафесійных школ паказвала даволі высокі ўзровень выканання грамадска-выхаваўчых і прафесійна-тэхнічных задач, нямала было і такіх, якія былі пазбаўлены права стварэння экзаменацыйных камі-

сій на атрыманне звання чаляднікa. На тэрыторыі Палескай школьнай акругі ў 1928/29 навучальным годзе ні ў адной з 5 яўрэйскіх школ (яўрэйская рамесная школа Таварыства падтрымкі прафесійнай і гаспадарчай працы сярод яўрэяў у Брэсце; яўрэйская рамесная школа Юдэля Пекуча ў Пінску; мужчынская яўрэйская рамесная школа Таварыства распаўсюджвання прафесійнай і гаспадарчай працы сярод яўрэяў у Сарнах; рамесная школа ПМШ у Пружанах; жаночая яўрэйская рамесная школа Янкеля Хольцмана ў Пінску) не былі ўтвораны экзаменацыйныя камісіі для прыёму экзаменаў на атрыманне звання чаляднікa [15, арк. 10].

На тэрыторыі Заходняй Беларусі не існавала школ прафесійнага ўдасканалення для яўрэяў, а 95% дзяржаўных грамадскіх школ дадзенага тыпу ўвогуле не прымалі яўрэяў на навучанне. Напрыклад, у 1934/35 навучальным годзе з 29 948 навучэнцаў польскіх дзяржаўных рамесна-прамысловых школ яўрэяў было толькі 4 803 (16%) [2, с. 81]. На тэрыторыі Брэсцкай школьнай акругі ў 1935 г. вучні-яўрэі навучаліся ў сярэдняй тэхнічнай школе імя Ю. Пілсудскага Палескага таварыства прафесійнай адукацыі ў Брэсце (1 вучань на дарожна-будаўнічым аддзеле); у прыватнай 3-гадовай прафесійнай летняй школе ПМШ у Брэсце (5 чалавек на кравецка-белашвейным аддзеле); у рамесна-прамысловай школе сяброў прафесійнай адукацыі ў Лунінцы (1 вучань на стalярна-мэблевым і 3 на слясарна-механічным аддзелах) [33, с. 36, 37, 42].

Адной з прычын, якія ўплывалі на скарачэнне колькасці кандыдатаў на атрыманне звання чаляднікa сярод яўрэяў у Заходняй Беларусі і ў Польшчы ў цэлым, было тое, што большасць вучняў, якая навучалася якой-небудзь прафесіі і працавалі ў яўрэйскіх майстэрнях, былі не зарэгістраваны. Паводле палажэнняў як прамысловага права 1927 г., так і закона ад 15 мая 1934 г., прымаць на навучанне ў рамястве маглі толькі рамеснікі, якія мелі дыплом майстра ў адпаведнай прафесіі. Майстроў жа сярод рамеснікаў-яўрэяў было мала, таму многія рамеснікі не заключалі з вучнямі дамоў аб навучанні. Яшчэ дамовы аб навучанні не заключаліся таму, што праца вучня павінна была аплачвацца, што, ў сваю чаргу, не задавальняла рамеснікаў, якія прымалі вучняў на навучанне. У сувязі з гэтым значная частка маладых рамеснікаў-яўрэяў мімаволі залічалася да катэгорыі «нелегальных» [2, с. 90].

Аднак неабходна адзначыць, што ў перыяд з 1927 па 1932 гг. назіраўся рост колькасці вучняў-яўрэяў на прафесійных курсах [2, с. 86]. Вялікім попытам у яўрэяў, асабліва ў дзяўчат (каля 80% ад усіх вучняў), карысталіся гадавыя прафесійныя курсы. Курсы крою і шыцця Барбары Альшэўскай у Брэсце наведвалі, напрыклад, 4 вучаніцы-яўрэйкі [33, с. 41]. У 1932 г. праўленне Віленскай школьнай акругі выдала канцэсію Саюзу рамеснікаў-яўрэяў на правядзенне курсаў прафесійнага ўдасканалення для вучняў у Міры (Навагрудскае ваяводства), якія наведваў 41 чалавек (30 краўцоў, 3 нарыхтоўшчыкі (шаўцы), 1 шапачнік, 2 сталяры, 1 маляр і 4 цырульнікі) [7, с. 22]. І. Барнштэйн у росце павелічэнні колькасці вучняў-яўрэяў на прафесійных курсах бачыць некалькі прычын. У якасці першай ён называе імкненне яўрэйскай моладзі да авалодання якой-небудзь прафесіяй. Другую ён бачыць у палажэннях прамысловага права 1927 г., а менавіта ў патрабаваннях адносна дадатковай кваліфікацыі ў прафесіі, неабходнай для атрымання адпаведных дыпламоў. Яшчэ адной прычынай росту ліку вучняў-яўрэяў на прафесійных курсах быў уздым у 30-я гг. XX ст. эміграцыі ў Палесціну – імкненне значнай часткі эмігрантаў, якія планавалі пасяліцца ў гарадах, атрымаць якую-небудзь рамесную прафесію [2, с. 86].

Пэўныя праблемы для вучняў-яўрэяў ў навучанні стваралі матэрыяльныя цяжкасці. Месцаў у бурсах пры рамесна-прамысловых школах для вучняў-яўрэяў адводзілася вельмі мала, а здымаць жыллё яны не мелі магчымасці, таму не маглі адпаведна падрыхтавацца да экзаменаў і як вынік – мінімальны прыток кандыдатаў-яўрэяў на атрыманне звання чаляднікa, а тым больш майстра. Галоўнай перашкодай для небагатых

вучняў-яўрэяў была яшчэ і высокая экзаменацыйная плата, якую ў большасці выпадкаў яны не ў стане былі ўнесці. Для кандыдатаў на атрыманне звання майстра экзаменацыйная плата магла даходзіць да 100 злотых [34]. Так, у справаздачы Навагрудскай раменай палаты за 1931 г. адзначалася, што матэрыяльныя цяжкасці паўплывалі на зніжэнне колькасці дапушчаных да экзамена на атрыманне звання чаляднікa кандыдатаў у кравецкім рамястве і рамястве шаўца, а таксама ў прафесіях, у якіх яўрэі складалі пераважную большасць (цесляры, стэльмахі, мяснікі, пекары, сталяры і г.д.) [2, с. 89].

**Заключэнне**

1. Акрамя атрымання раменай карты, закон «Аб прамысловым праве» 1927 г. яшчэ адной ўмовай для самастойнага вядзення рамяства называў пацвярджэнне прафесійных здольнасцей. Таму ўзрастала неабходнасць атрымання прафесійнай адукацыі не толькі раменікамі-пачаткоўцамі, але і вопытнымі раменікамі. Раменік, які не мог даказаць фармальна прафесійнай кваліфікацыі, з'яўляўся «нелегальным», ці г.зв. партачом, з якім вялі барацьбу польскія ўлады і арганізацыі цэхавых раменіцкіх майстроў. Польскім заканадаўствам была распрацавана даволі выразная арганізацыйная структура раменага навучання. Рашэннем праблемы навучання ў рамястве займаліся раменапрамысловыя школы, школы-майстэрні, школы прафесійнага ўдасканалення, а таксама прафесійныя курсы. Абавязковай умовай было заключэнне дамовы аб навучанні і рэгістрацыя вучняў у раменай палаце. Пасля заканчэння прафесійных школ была прадугледжана здача іспыту, які складаўся з праверкі ведаў і ўменняў, неабходных для самастойнай раменай працы. Менавіта ад яго выніку залежала далейшая прафесійная дзейнасць раменіка.

2. Раменае навучанне на заходнебеларускіх землях у 20–30-я гг. ХХ ст. развівалася складана і сутыкалася з пэўнымі цяжкасцямі. Па-першае, невялікая колькасць прафесійных школ (на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ў 1936/37 навучальным годзе налічвалася 18 прафесійных школ, а ў Палескім ваяводстве ў 1935 г. – усяго 10). Па-другое, слабае тэхнічнае абсталяванне раменых майстэрань, у якіх ажыццяўлялася навучанне (для раменых майстэрань Заходняй Беларусі быў характэрны ручны спосаб вытворчасці). Яшчэ адной цяжкасцю, з якой сутыкалася раменае навучанне на заходнебеларускіх землях у даследуемы перыяд, была непісьменнасць асноўнай часткі раменікаў, а таксама слабыя веды заходнебеларускімі раменікамі польскай мовы. Для заходнебеларускіх раменікаў была характэрна і слабая тэарэтычная падрыхтоўка. Вялікай праблемай для раменікаў была высокая экзаменацыйная плата (амаль 80% кандыдатаў не дапускаліся да здачы іспыту па прычыне таго, што не маглі ўнесці экзаменацыйную плату, якая для атрымання звання чаляднікa вар'іравала ад 15 да 60 злотых, а для кандыдатаў у майстры наогул дасягала 100 злотых). Складаным было і стварэнне экзаменацыйных камісій па шматлікіх раменых спецыяльнасцях у сувязі з недахопам майстроў (на тэрыторыі Палескага ваяводства ў даследуемы перыяд з 67 раменых прафесій толькі ў 15–18 меліся майстры, а ў Беластоцкім ваяводстве на 12 730 раменікаў прыходзілася толькі 1 096 майстроў). Складанай была і сітуацыя ў навучанні яўрэяў: яны былі вымушаны атрымліваць неабходныя веды ў прыватных раменых школах і на прафесійных курсах, якія існавалі на сродкі розных яўрэйскіх таварыстваў.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

2. Bornstein, I. Rzemiosło żydowskie w Polsce / I. Bornstein. – Warszawa : Nakładem Instytutu Badań Spraw Narodowościowych, 1936. – 189 s.

3. Mięso, J. Szkoły zawodowe w Polsce w latach 1918–1939. Ich rozwój, organizacja i funkcje społeczne / J. Mięso. – Wrocław, 1988. – 303 s.

4. Kwiecień, S. Polskie prawo przemysłowe. 1927–1939 / S. Kwiecień. – Lublin : Wyd-wo KUL, 2010. – 153 s.

5. Отчёт ремесленной Палаты в Бресте над Бугом о состоянии ремёсел в Полесском воеводстве за 1936 г. // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 386.

6. Ziemie północno-wschodnie Rzeczypospolitej / red. J. Święcicki. – Wilno, 1933. – 68 s.

7. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Nowogródku za rok 1932. – Nowogródek, 1932. – 56 s.

8. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Wilnie za 1932 rok. – Wilno, 1933. – 99 s.

9. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Wilnie za 1935 rok. – Wilno, 1936. – 67 s.

10. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Wilnie za 1934 rok. – Wilno, 1935. – 47 s.

11. Sprawozdanie wojewody Poleskiego na posiedzenie Rady wojewódzkiej w grudniu 1935 r. – Brześć-nad-Bugiem : Druk. Nadbużańska, 1935. – 139 s.

12. Sprawozdanie wojewody Poleskiego na posiedzenie Rady wojewódzkiej w grudniu 1936 r. – Brześć-nad-Bugiem : Druk. Nadbużańska, 1936. – 78 s.

13. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Białymstoku o stanie gospodarczym rzemiosła w roku 1936. – Białystok, 1937. – 47 s.

14. Переписка с попечительством Брестского школьного округа об открытии женской ремесленной школы в городе Лунинце и курсов кройки и шитья // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 818.

15. Распоряжения Министерства вероисповедания и публичного образования и устав об организации экзаменационных комиссий при ремесленно-промышленных школах для проведения экзаменов на получения звания подмастерья и списки подмастерьев // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 583.

16. Сообщение и переписка с Министерством вероисповеданий и общественного образования Польши и др. об организации государственных ремесленно-промышленных курсов в Пружанском повете // ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 3. – Спр. 61.

17. Отчёты о работе ремесленно-промышленных школ Брестского школьного округа за 1935–1936 годы // ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 3. – Спр. 123.

18. Rozporządzenie Ministra przemysłu i handlu w porozumieniu z Ministrem wyznań religijnych i oświecenia publicznego z dnia 14 grudnia 1927 r. «W sprawie ustalenia, w jakiej mierze świadectwa ukończenia szkół technicznych uważać należy za dowód uzdolnienia zawodowego do samoistnego prowadzenia rzemiosła» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1927. – № 118. – Poz. 1014. – 1686 s.

19. Rozporządzenie Ministra przemysłu i handlu wydane w porozumieniu z Ministrem wyznań religijnych i oświecenia publicznego z dnia 25 maja 1938 r. «W sprawie ustalenia, w jakiej mierze świadectwa ukończenia szkół technicznych i artystycznych należy uważać za dowód uzdolnienia zawodowego do prowadzenia przemysłu rzemieślniczego» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1938. – № 40. – Poz. 332. – S. 695–698.

20. Rozporządzenie Prezydenta Rzeczypospolitej z dnia 7 czerwca 1927 r. «O prawie przemysłowem» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1927. – № 53. – Poz. 468. – S. 697–720.

21. Правила Брестской ремесленной палаты об обучении подмастерьев; списки членов экзаменационных комиссий по проведению испытаний граждан, ходатайствующих о получении звания мастера // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 666.

22. Miedzińska, J. «Nauka zawodu» w przemyśle i rzemiośle / J. Miedzińska. – Warszawa, 1931. – 31 s.

23. У новай айчыне. Штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд. – Беласток, 2001. – 301 с.

24. Rozporządzenie Ministra wyznań religijnych i oświecenia publicznego w porozumieniu z Ministrami przemysłu i handlu oraz robot publicznych z dnia 23 października 1928 r. «W sprawie regulaminu komisyj dla egzaminów na czeladników przy szkołach rzemieślniczo-przemysłowych państwowych lub przez Państwo uznanych» // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej. – 1929. – № 3. – Poz. 29. – S. 52–54.

25. Протоколы экзаменационной комиссии и заявления граждан о допуске к экзаменам на получение звания подмастерья с приложением свидетельств о квалификации и автобиографии // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 685.

26. Устав и протоколы заседаний экзаменационной комиссии по приёму экзаменов у ремесленников-кустарей; заявления, свидетельства о работе и автобиографии кустарей, допущенных к экзаменам // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 69.

27. Протоколы экзаменационной комиссии и заявления граждан о допуске их к экзаменам на получение звания подмастерья с приложением автобиографий и свидетельств о квалификации последних // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 683.

28. Положение об организации экзаменационной комиссии по приёму экзаменов ремесленников-кустарей; бюджет Брестской ремесленной палаты на 1930 г.; докладная записка представителя палаты о мерах ликвидации конкуренции кустарей, списки членов экзаменационной комиссии и переписка с Министерством промышленности и торговли и др. о работе комиссии и др. вопросам // ДАБВ. – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 668.

29. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Białymstoku o stanie gospodarczym rzemiosła w roku 1930. – Białystok, 1931. – 44 s.

30. Klaftenowa, C. Zagadnienie produktywizacji i szkolnictwo zawodowe wśród żydów / C. Klaftenowa // Miesięcznik żydowski. – Czerwiec–grudzień 1931. – S. 123–135.

31. Majecki, H. Oświata żydowska na Białostocczyźnie w okresie międzywojennym / H. Majecki // Białostocczyzna. – 1998. – № 1. – С. 49–57.

32. Отчёты об организации и деятельности частной еврейской ремесленной школы в г. Пинске за 1934 г. // ДАБВ. – Фонд 59. – Воп. 3. – Спр. 103а.

33. Sprawozdanie Izby rzemieślniczej w Brześciu nad Bugiem o stanie gospodarczym rzemiosła w roku 1935. – Brześć nad Bugiem, 1936. – 123 s.

34. Maurycy, O. Walka z żydowskim światem pracy [1936] / O. Maurycy [Электронный ресурс]. – 2013. – Режим доступа :http://lewicowo.pl/walka-z-zydowskim-swiatem-pracy/ – Дата доступа : 03.01.2013.

***Lavreenko L.V.* The Education of Craftmen and its Organization in Western Belarus in the 1920–1930-s**

The article is devoted to the state of teaching handicraft and its organization in Western Belarus in the 1920–1930-s. The author characterizes handicraft-industrial schools, schools-workshops, schools of workmanship and professional courses where craftsmen were taught, and thoroughly analyzes the conditions of access to the schools and the teaching agreement concluded by the sides. The system of exams and awarding the status of an apprentice and master are considered. The author states that during the period considered in the article, a craftsman who only started his work or worked in any branch of handicraft had to study the craft and get a certain certificate. The author makes a conclusion, that teaching handicraft on the territory of Western Belarus in the 1920–1930-s. was complicated and faced many difficulties.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 28.06.2013